ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ ГОМЕЛЬСКОГО ОБЛИСПОЛКОМА

XIX республиканская выставка
научно-методической литературы,
педагогического опыта и творчества
учащейся молодёжи в рамках
Года народного единства

# Упэўнены крок у будучае з павагай да мінулага (з вопыта работы выкладчыка Ільеня І.А)

**Автор:**
Ильеня Ирина Александровна, преподаватель
белорусского языка и литературы
учреждение образования «Светлогорский
государственный индустриальный колледж»




Гомель, 2021

# Змест

Уводзіны

1. Упэўнены крок у будучае з павагай да мінулага.
2. Маральна-этычныя праблемы, сямейныя каштоўнасці ў п'есе А.Макаёнка «Зацюканы апостал».
   *(план-канспект урока з выкарыстаннем інфарматыўна - камунікатыўных тэхналогій, тэхналогіі поўнага засваення ведаў).*
3. Беларуская мова будзе жыць, пакуль мы яе чуем! *Выхаваўчая гадзіна.*
4. Захаваем любімую спадчыну!
   *Экскурсія па музейным пакоі. Сучасныя падыходы выхавання.*
5. Сэрцам адданыя роднай зямлі.
   *Сямейная нарада. Бацькі і дзеці: гульня – спаборніцтва па роднаму гораду Светлагорску.*
6. Родному городу – моё будущее.
   *Исследовательская деятельность: Город. Молодёжь. Будущее.*

## Упэўнены крок у будучае з павагай да мінулага



*"Любоў да Радзімы і адказнае стаўленне кожнага грамадзяніна да сваёй дзейнасці - гэта залог будучай моцнай Беларусі", - так гаварыў Прэзідэнт Беларусі на VI Усебеларускім народным сходзе, дзе быў вызначаны курс на павышэнне дабрабыту і якасці жыцця кожнага чалавека, забеспячэнне стабільнасці, міру і парадку ў краіне…*

Развіццё краіны залежыць ад таго, наколькі моцна прывіта падрастаючаму пакаленню пачуццё любові да сваіх родных, да сваёй сям'і, да свайго народа, да Радзімы. Таму на дадзеным этапе развіцця сучаснай Беларусі паўстае асабліва актуальна пытанне аб грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі.

Маладое пакаленне знаходзіцца ў няпростай сітуацыі, спрабуючы набываць жыццёвыя арыенціры. Дапамагчы зрабіць правільны выбар на гэтым складаным шляху станаўлення асобы грамадзяніна закліканы мы, выкладчыкі гуманітарных дысцыплін.

Таму адной з мэт маёй педагагічнай дзейнасці – фарміраваць у навучэнцаў актыўную грамадскую пазіцыю па выхаванню сапраўдных грамадзян і патрыётаў сваёй краіны. Разумею, што неабходна навучыць моладзь быць чэснымі да сябе, уносіць свой асабісты ўклад у развіццё краіны, разумець, што ад нашай пазіцыі залежыць наша будучыня.

Прыярытэтнымі накірункамі ў маёй рабоце з'яўляюцца:

- выхаванне духоўных і маральных каштоўнасцей;
- фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці;
- патрыятычнае выхаванне;
- утрыманне сямейных каштоўнасцей;
- станаўленне актыўнай грамадзянскай пазіцыі;
- фарміраванне добрасумленных адносін да будучай прафесіі.

Як вядома, асноўнай мэтай педагагічнага працэсу з'яўляецца навучанне і выхаванне, вынікам чаго можна лічыць не толькі набыццё новых ведаў, уменняў і навыкаў, але і змяненне самой асобы навучэнца, фарміраванне яго жыццёвай актыўнасці, развіццё маральных якасцей.



Перада мною заўсёды пастаўлена задача выкарыстанне сучасных падыходаў, метадычных прыёмаў, якія дазваляюць эфектыўна працаваць з навучэнцамі, максімальна выкарыстоўваючы іх творчы патэнцыял, развіваючы мысленне і выхоўваючы у іх маральныя якасці (ДАДАТАК 1).



Працэс фарміравання грамадзянскай пазіцыі ажыццяўляецца на ўроках беларускай мовы і літаратуры, а таксама ў час пазаўрочнай дзейнасці. Так у гэтым навучальным годзе яскравым прыкладам праяўлення грамадзянскасці і патрыятызму для навучэнцаў адзначаецца ўдзел выкладчыкаў, супрацоўнікаў каледжа ў агульнай дыктоўцы, прысвечанай Міжнароднаму дню роднай мовы, а таксама пісьменнікам-юбілярам І.Мележу, І.Шамякіну тэкст якога чытаўся на свяце, і актыўны масавы ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах (ДАДАТАК 2).



На занятках і выхаваўчых гадзінах расказваю навучэнцам аб тым, якое грамадства мы будуем, якая яго эканамічная аснова і дзяржаўная структура, інтарэсы якіх сацыяльных груп насельніцтва абараняе дзяржава, што павінна садзейнічаць развіццю тых прадстаўнікоў насельніцтва, якія ахоўваюць інтарэсы грамадства.



Творчасць класікаў і творы народнай культуры, у якіх паказаны важныя вехі гістарычнага шляху беларусаў, станаўленне асобы грамадзяніна, яго развіццё, знаходзяць адлюстраванне ў запланаваных мерапрыемствах, прысвечаных сёлета 100-годдзю з Дня нараджэння паэтаў-юбіляраў І.Мележа і І.Шамякіна: прагляд дакументальных фільмаў “Імгненні жыцця”, “І.Мележ. Туманы над багнаю”, удзел у конкурсах букцыюбераў «Раскажы аб прачытанай кнізе»,

малюнках па матывах твораў, прэзентацый, удзел у інтэрнэт-віктарыне, афармленне выстаў «Летапісцы народнага лёсу».

У навучэнцаў вучу ацэньваюць сілу і дабрыню, сумленнасць і вернасць, храбрасць і працавітасць. Хочацца, каб кожны зразумеў і атрымаў вялікія магчымасці рэалізаваць сябе як самастойная асоба ў розных сферах жыцця, і ў той жа час разумеў, што ўзрасла адказнасць яго за свой лёс і лёс іншых людзей.




На кожным з беларусаў ляжыць адказнасць за лёс краіны. І галоўнае - ва ўсіх ёсць роўныя, спрыяльныя стартавыя ўмовы для таго, каб стаць паспяховым і мяняць жыццё ў Беларусі да лепшага: навукова-даследчая дзейнасць “Родному городу - моё будущее”, дзе ўсвядомлены выбар будучай прафесіі непасрэдна звязаны з любоўю да горада, сваёй адказнасцю перад дзяржавай (ДАДАТАК5 ).



Рознымі шляхамі далучаю навучэнцаў да нацыянальнай гісторыі і культуры, выхоўваю паважлівыя адносіны да роднай мовы; прывіваю замілаванне да тых мясцін, дзе чалавек нарадзіўся і вырас; фарміраю грамадзянскія пачуцці; выражаю гонар за сацыяльныя і культурныя дасягненні Радзімы; выхоўваю павагу да гістарычнага мінулага сваей краіны і атрыманых у спадчыну традыцый; вучу імкнуцца прысвячаць сваю працу, сілы і здольнасці для росквіту Радзімы. Вельмі важна раскрыць перад навучэнцамі нацыянальныя асаблівасці, самабытнасць з’яў беларускай культуры для станаўлення агульначалавечых каштоўнасцей: гуманізму, дабра, прагрэсу (ДАДАТАК 2).



Добра разумею, што неабходна паказаць навучэнцам значны ўклад беларускіх асветнікаў, грамадскіх дзеячаў, вучоных у станаўленні і развіцці дзяржаўнасці. У гэтым дапамагаюць правядзенне літаратурных вечарын, выхаваўчых

гадзін, розных пазакласных мерапрыемств.

Метадычна правільна арганізаванае мерапрыемства забяспечвае адзінства пазнавальнай, працоўнай, грамадскай актыўнасці, фарміруе маральны склад асобы.

Сваю галоўную задачу як педагога бачу ў тым, каб сфарміраваць у навучэнцаў актыўную жыццёвую пазіцыю, выхаваць людзей з высокімі маральнымі прынцыпамі – патрыётаў Беларусі.



Паняцці патрыятызм”, “грамадзянска-патрыятычнае выхаванне” набываюць сёння новы сэнс. На мой погляд, выхаваць грамадзяніна сёння – значыць падрыхтаваць чалавека да рашэння надзённых задач нашай краіны, выканання функцый адказнага гаспадара і працаўніка, арганізатара, абаронца Радзімы і сваёй сям’і, які гатовы да ўдзелу ў актыўнай дзейнасці на карысць роднай дзяржаве.

На шляху фарміравання грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў важнае



значэнне мае выбар формы правядзення заняткаў. Часта звяртаюся да дыскусій, дыялогаў, дыспутаў, выкананне фальклорных свят, упершыню запланавана сумеснае мерапрыемства навучэнцаў з бацькамі. (ДАДАТАК 4).

*«Моладзь павінна засвоіць: без цяжкай працы, здольнасцей і таленту багатым нельга стаць”, – так адзначаў Кіраўнік дзяржавы.*

Нялёгка выхаваць грамадзяніна, зрабіць гэта – умела спалучыць навучальныя тэмы з выхаваннем грамадзянскасці, патрыятызму, напоўніць



жыццё выхаванцаў клопатамі пра сябе, калектыў, краіну, быць адказным ва ўсіх жыццёвых сітуацыях.

Выкладчык заўсёды быў і застаецца своеасаблівым маяком, які асвятляе гэты шлях промнямі надзеі, упэўнасці, веры ў тое, што наша

моладзь – працавітыя, творчыя людзі, гатовыя паклапаціцца пра будучыню.



Пазакласная работа па грамадзянскаму выхаванню прадстаўляе вялікія магчымасці ў фарміраванні грамадзянскасці, у выхаванні грамадзянскіх якасцей. Добрай традыцыяй па захаванню багацця нацыянальнай культуры, фарміраванню любові да Айчыны, свайго народа стала правядзенне шэрагу мэрапрыемств на працягу тыдня моўных дысцыплін. Так у каледжы штогод арганізоўваюцца і праведзяцца шэраг мерапрыемств, прысвечаных Дню роднай мовы, гульні-спаборніцтвы, віктарыны, турніры, сачыненні, выставы малюнкаў, серыі мерапрыемств, прысвечаных юбілярам, літаратурна-музычныя кампазіцыі, літаратурныя гасцёўні, творчыя конкурсы (Instagram. Post. By. Светлогорский колледж).









Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь
Пра музейны пакой
Уліковая картка

Таксама арганізоўваюцца і праводзяцца экскурсіі ў музей гісторыі горада, карцінную галерэю па вывучэнні гісторыі і культуры роднага краю. У межах пазаўрочнай дзейнасці асаблівую ўвагу звяртае дзейнасць музейнага пакоя, дзе вядзецца работа па вывучэнню фальклорнай спадчыны. Ідэйна-эстэтычнае ўздзеянне аказвае і ўдзел навучэнцаў у разнастайных мерапрыемствах творчага характару (ДАДАТАК 3). Навучэнцамі створана старонка на сайце каледжа аб дзейнасці музейнага пакоя (sgik.of.by).

*"Трэба зрабіць так, каб гісторыя кожнага з нас стала часткай гісторыі нашай прыгожай утульнай краіны. "І запомніце: мы яе павінны берагчы і нікому не аддаваць. Таму што любімую не аддаюць"* (з выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на VI Усебеларускім народным сходзе).

**І калі да навучэнцаў з верай, надзеяй і любоўю, то можна зрабіць вялікую справу на шляху ўпэўненага кроку ў будучыню!**